Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

ЗАЦВЕРДЖАНА
Вучэбна-метадычным аб'яднаннем
ВНУ Рэспублікі Беларусь
па гуманітарнай адукацыі
7 красавіка 2006 г.
Рэгістрацыйны № ТД-ДГ.021/тып.

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

Вучэбная праграма
для вышэйшых навучальных устаноў
па спецыяльнасці 1-21 05 01
Беларуская філалогія

Мінск
"РІВШ"
2006

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

УДК 811.161.3’36’0(075.4)
ББК 81.2 Беи-2
Г51

Рэкамендавана да зацвярджэння
ў якасці тыпавой

Вучэбна-метадычным Саветам філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта 1 лютага 2006 г. (пратакол №5);
кафедрай гісторыі беларускай мовы філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта 17 студзеня 2006 г. (пратакол №7)

Складальнікі:

доктар філалагічных навук, прафесар *Л. М. Шакун*;
кандыдат філалагічных навук, прафесар кафедры гісторыі беларускай мовы Беларускага дзяржаўнага універсітэта *В. П. Красней*;
кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры гісторыі беларускай мовы Беларускага дзяржаўнага універсітэта *Г. І. Кулеш*;
кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры гісторыі беларускай мовы Беларускага дзяржаўнага універсітэта *Г. К. Ціванова*;
кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры гісторыі беларускай мовы Беларускага дзяржаўнага універсітэта *М. І. Свістунова*

Рэцэнзенты:

кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры гісторыі беларускай мовы і дыялекталогіі Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта імя А.С. Пушкіна *М. М. Аляхновіч*;
кандыдат філалагічных навук, навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі беларускай мовы Інстытута мовазнаўства імя Я.Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі *Э. В. Ярмоленка*

Г51 **Гісторыя** беларускай мовы : вучэб. праграма для выш. навуч. установ па спецыяльнасці 1-21 05 01 Беларуская філалогія / склад.: Л. М. Шакун [і інш.]. – Мінск : РІВШ, 2006. – 32 с.

**УДК 811.161.3’36’0(075.4)**
**ББК 81.2 Беи-2**

© Афармленне. ДУА “Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы”, 2006

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

# Частка I. ГІСТАРЫЧНАЯ ГРАМАТЫКА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

## Тлумачальная запіска

Гістарычнай граматыцы беларускай мовы адводзіцца важная роля ў падрыхтоўцы філолагаў-беларусаведаў. Гістарычная граматыка як адна з састаўных частак курса гісторыі беларускай мовы адрозніваецца ад другой яго часткі – гісторыі літаратурнай мовы – аб’ектам даследавання, паколькі аналізуе гісторыю народна-размоўнай, а не кніжна-літаратурнай мовы.

Мэта гэтага курса – даць навуковае ўяўленне пра структуру і функцыянаванне моўнай сістэмы на розных этапах яе развіцця, глыбокае разуменне заканамернасцей і першапрычын фанетычных і граматычных змен. Філалагічнае веданне мовы прадугледжвае ўменне арыентавацца ў разнастайных варыянтных з’явах агульнанароднай беларускай мовы, усведамляць працэсы станаўлення моўнай нормы і ў пэўнай ступені прагназаваць шляхі і накірункі далейшага развіцця. Менавіта такія задачы і ўлічваюцца пры планаванні лекцыйнай часткі, практычных заняткаў і арганізацыі самастойнай працы студэнтаў над асобнымі тэмамі курса. Мэтазгодным з’яўляецца правядзенне пасля вывучэння кожнага раздзела лабараторных заняткаў, дзе студэнты па пісьмовых крыніцах самастойна выяўляюць і аналізуюць вывучаныя фанетычныя і граматычныя з’явы.

Для авалодання курсам гістарычнай граматыкі беларускай мовы неабходна грунтоўная тэарэтычная падрыхтоўка студэнтаў, а менавіта веданне сучаснай беларускай мовы, асноўных тэм курсаў старaславянскай мовы і беларускай дыялекталогіі, пэўных пытанняў агульнага мовазнаўства, гісторыі народа і краіны. Усведамленне гісторыі развіцця сістэмных адносін немагчыма без супастаўлення з фактамі блізкароднасных (рускай і украінскай) і суседніх (у першую чаргу – польскай) моў.

Даная праграма ўлічвае папярэдні вопыт выкладання гістарычнай граматыкі беларускай мовы ў ВНУ і грунтуецца на праграме “Гісторыя беларускай мовы” (1979) праф. Л.М. Шакуна. У сувязі з гэтым у літаратуры, рэкамендаванай па курсу, адзначаецца пэўны тэрміналагічны разнабой. Аўтары гэтай праграмы аддаюць перавагу тэрмінам **страта рэдукаваных** замест *падзенне рэдуцыраваных* (“Нарысы...”, Праграма 1979 Л.М. Шакуна і інш.), **старажытны перыяд беларускай мовы** замест *старажытнарускі перыяд* (“Нарысы...”, “Гістарычная марфалогія...” А.М. Булыкі, А.І. Жураўскага, І.І. Крамко, Праграма 1979 Л.М. Шакуна) і *агульнаўсходнеславянскі перыяд* (“Гістарычная граматыка...” Ф.М. Янкоўскага) і інш. Выкладчык, зыходзячы з гісторыі развіцця беларускага мовазнаўства, павінен даць тлумачэнні студэнтам па пэўных тэрміналагічных разыходжаннях, каб увесці ў карыстанне навуковую і вучэбную літаратуру ранейшых часоў выдання.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

# Уводзіны

1. Бесперапыннасць змянення і развіцця мовы. Гістарызм як дзейсны сродак асэнсавання мовы на ўсіх этапах яе развіцця, у тым ліку і на сучасным. Сувязь гісторыі мовы з гісторыяй народа. Значэнне гісторыі мовы для тэорыі пазнання, гісторыі і мыслення.

Гісторыя мовы як навука. Падзел навукі аб гісторыі беларускай мовы на гістарычную граматыку і гісторыю літаратурнай мовы. Прадмет і задачы гістарычнай граматыкі як асобнай лінгвістычнай дысцыпліны гістарычнага цыкла. Умоўнасць назвы гэтай дысцыпліны, паколькі яна вывучае гісторыю ўсіх узроўняў моўнай сістэмы. Агульныя і спецыфічныя рысы гістарычнай граматыкі і гісторыі літаратурнай мовы як розных раздзелаў навукі аб гісторыі беларускай мовы. Праблема сінтэтычнага курса гісторыі беларускай мовы.

Адносіны гістарычнай граматыкі да іншых лінгвістычных дысцыплін гістарычнага цыкла (параўнальна-гістарычнай граматыкі славянскіх моў, стараславянскай мовы, гістарычнай дыялекталогіі), а таксама тых, якія вывучаюць сучасны стан мовы (сучаснай дыялекталогіі, апісальнай граматыкі сучаснай літаратурнай мовы і г.д.). Гістарычная граматыка і іншыя навукі аб гісторыі беларускага народа (сацыяльная гісторыя, археалогія, этнаграфія).

Месца і значэнне лінгвістычных дысцыплін гістарычнага цыкла, у прыватнасці гістарычнай граматыкі, у сістэме філалагічнай падрыхтоўкі спецыялістаў па роднай мове і літаратуры. Гістарычная граматыка як навуковая база пры вывучэнні мовы і літаратуры ў сярэдняй школе.

2. Галоўныя крыніцы вывучэння гістарычнай граматыкі. Пісьмовыя помнікі, разнастайнасць іх тыпаў і неаднароднасць з пункту гледжання інфармацыйнасці для гістарычнай граматыкі. Агляд найбольш каштоўных помнікаў старажытнага пісьменства. Агульнанародная беларуская мова ў яе дыялектах і літаратурна апрацаванай форме як матэрыял для гістарычнай граматыкі. Выкарыстанне фактаў роднасных моў і іх дыялектаў у гістарычным і сучасным аспекце.

Дапаможныя крыніцы: анамастыка (тапаніміка, асабліва гідраніміка, антрапаніміка), адметнасці ў форме асобных запазычаных слоў, сведчанні старажытных філалагічных распрацовак і інш.

3. Асноўныя метады вывучэння гістарычнай граматыкі. Параўнальна-гістарычны метад. Метады ўнутранай і знешняй рэканструкцыі, тыпалагічнага супастаўлення, сінхранічнага вывучэння мовы (сінхронных зрэзаў) у дыяхраніі і інш. Магчымасці і межы прымянення розных метадаў; іх суадносіны.

4. Кароткія звесткі з гісторыі распрацоўкі гістарычнай граматыкі беларускай мовы. Я.Ф. Карскі – заснавальнік гістарычнай граматыкі

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

беларускай мовы. Вывучэнне гістарычнай граматыкі беларускай мовы ў паслякастрычніцкі час.

5. Праблема перыядызацыі гісторыі беларускай мовы ў сувязі з гісторыяй беларускага народа і з улікам найбольш важных інтралінгвістычных фактараў (эвалюцыі моўнай структуры).

Гістарычныя ўмовы ўтварэння і развіцця беларускай мовы. Драбленне агульнаславянскага моўнага адзінства і моўнае вылучэнне ўсходніх славян (VI – IX стст.). Старжытныя ўсходнеславянскія плямёны і пытанне аб іх дыялектах. Узнікненне дыялектных аб'яднанняў у сувязі з узвышэннем асобных феадальных фарміраванняў на ўсходнеславянскіх землях (у прыватнасці, Полацкага княства – на тэрыторыі сучаснай Беларусі). Канчатковае афармленне беларускай мовы ў часы Вялікага княства Літоўскага. Роля гарадскіх кайнэ як асобных разнавіднасцей гутарковай мовы наддыялектнага тыпу і пісьменства ў працэсах моўнай інтэграцыі беларускага народа. Асаблівасці развіцця беларускай мовы ў розных гістарычных умовах.

6. Структурнае падабенства і галоўныя адметныя рысы ўсходнеславянскіх моў як вынік агульных і спецыфічных працэсаў у іх развіцці. Месца беларускай мовы сярод іншых славянскіх моў.

## Фанетыка

1. Прадмет і задачы гістарычнай фанетыкі як гісторыі гукавых змяненняў і фаналагічных адносін. Узнаўленне гукавой сістэмы мовы ў той ці іншы перыяд яе развіцця на падставе сведчанняў пісьмовых помнікаў. Методыка фанетычнай інтэрпрэтацыі фактаў, выяўленых у пісьмовых помніках шляхам карэктыруючага супастаўлення з данымі сучаснай мовы і лінгвістычнай геаграфіі.

2. Гукавая сістэма ўсходнеславянскіх гаворак дапісьмовай пары. Структура склада: прынцып нарастаючай гучнасці, адсутнасць закрытых складоў; нерухомасць граніц склада, складовы сінгарманізм – тэндэнцыя да спалучэння ў адным складзе гукаў аднароднай артыкуляцыі (цвёрды зычны + непярэдні галосны, няцвёрды зычны + пярэдні галосны). Пытанне аб складападзеле і словаўтваральнай ролі галосных і плаўных у складзе перад зычнымі. Развіццё пратэтычных зычных у сувязі з тэндэнцыяй да прыкрытасці пачатковага склада ў розных праславянскіх дыялектах.

Адметнасць старажытнага славянскага націску: адрозненні ў націску з акутавай (узыходнай) і цыркумфлекснай (зыходнай) інтанацыяй.

Галосныя. Склад галосных. Класіфікацыя іх паводле рада і пад'ёму, удзелу губ пры ўтварэнні (наяўнасці або адсутнасці лабіялізацыі).

Сістэма вакалізму. Супрацьпастаўленне галосных паводле пярэдняй – непярэдняй зоны ўтварэння.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

Галосныя пярэдняга і непярэдняга ўтварэння ў пачатку слова і пасля памякчаных і непамякчаных зычных.

Чатыры ступені пад'ёму языка пры ўтварэнні галосных і шматчленнае супрацьпастаўленне іх на гэтай падставе.

Месца лабіялізаваных і нелабіялізаваных галосных у сістэме вакалізму.

Колькаснае адрозненне галосных як асноўная рыса тагачаснага вакалізму ў параўнанні з вакалізмам сучаснай беларускай мовы. Страта супрацьпастаўлення пярэдніх – непярэдніх галосных пасля памякчэння зычных. Галосныя поўнага ўтварэння і рэдукаваныя. Месца рэдукаваных [ь] і [ъ] у сістэме галосных. Моцная і слабая пазіцыя рэдукаваных. Пазіцыйнае змяненне моцных – слабых рэдукаваных. Рэдукаваныя ў спалучэннях з плаўнымі [р] і [л] у каранях слоў паміж зычнымі. Рэдукаваныя перад [j]; з'яўленне напружаных [ыˇ] і [иˇ]. Дыялектныя адрозненні ў якасці напружаных [ыˇ] і [иˇ].

Насавыя галосныя і іх гісторыя. Адсутнасць насавых галосных ва ўсходнеславянскіх гаворках у сувязі са змяненнем [ǫ] > [у] і [ę] > [ä]. Паўмяккасць зычных перад [ä] (а-пярэднім). Сведчанні аб часе страты насавых усходнеславянскімі гаворкамі. Гукавое значэнне і гісторыя ўжывання ва ўсходнеславянскім пісьменстве літар @ (юс вялікі) і # (юс малы). Гістарычныя чаргаванні, звязаныя з дэназалізацыяй насавых галосных.

Фанема ‹ě›, што на пісьме абазначалася літарай һ (яць), якасць яе ў розных усходнеславянскіх дыялектах.

Зычныя. Класіфікацыя зычных паводле месца і спосабу ўтварэння. Зычныя звонкія і глухія. Сінтагматычная спалучальнасць зычных. Дысіміляцыя і спрашчэнне груп зычных. Страта [j] у пачатку слова.

Характарыстыка зычных па цвёрдасці – мяккасці. Шматчленная супрацьпастаўленасць зычных паводле рада. Палатальныя зычныя, супрацьпастаўленыя губным, зубным і заднеязычным (гутуральным) зычным. Зычныя непамякчоныя, напаўпамякчоныя (перад галоснымі пярэдняга рада) і спрадвечна мяккія. Пазіцыйная мена зычных: цвёрдасць або паўмяккасць непамякчоных. Адсутнасць суадноснасці зычных паводле цвёрдасці – мяккасці і звонкасці – глухасці (акрамя магчымасці аглушэння канцавога [з] у прыназоўніках-прыстаўках *без-*, *въз-*, *из-*, *роз-/раз-*) як спецыфічная асаблівасць кансанантызму старажытнай пары ў параўнанні з кансанантызмам сучаснай беларускай мовы.

Залежнасць зычных ад наступных галосных. Абмежаванасць спалучэнняў зычных. Асноўныя тыпы спалучэнняў зычных, адрозных паводле месца і спосабу ўтварэння. Адсутнасць зычных на канцы слоў у сувязі з адкрытасцю склада. Вакалістычны характар гукавой сістэмы ўсходнеславянскіх гаворак дапісьмовай пары.

3. Адлюстраванне вынікаў фанетычных працэсаў ва ўсходнеславянскіх гаворках дапісьмовай пары. Пераходныя памякчэнні

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

заднеязычных у суседстве з галоснымі пярэдняга рада (першая, другая і трэцяя палаталізацыі). Пераходнае памякчэнне спалучэнняў заднеязычных з зубнымі зычнымі (*gt, *kt) перад галоснымі [i], [i]. Змяненне спалучэнняў *gv, *kv перад [ě]. Асаблівасці спалучэння зычных і груп зычных з [j]. Своеасаблівы лёс спалучэнняў *ort, *olt. Канчатковае афармленне спалучэнняў *torot, *teret, *tolot, *telot (першае поўнагалоссе). Гіпотэзы адносна яго паходжання. Чаргаванні галосных у межах марфемы. Чаргаванні, абумоўленыя манафтангізацыяй дыфтонгаў.

4. Усходнеславянскія дыялектныя адрозненні ў гукавой сістэме Адрозненні ў якасці звонкага заднеязычнага зычнага ([g], [γ], [h]). Неаднолькавая якасць звонкага губнога спіранта (губна-зубны [v] і губна-губны [w]). Адсутнасць вынікаў другой і трэцяй палаталізацый заднеязычных у некаторых дыялектах. Адрозненні ў якасці зычных, суадносных з праславянскімі *zdj, *zgj. Слабае супрацьпастаўленне зубных і альвеалярных зычных і выкліканае гатым цоканне, неадрозненне мяккіх свісцячых і шыпячых.

5. Фанетычныя змяненні пісьмовай пары. Другаснае памякчэнне зычных як вынік далейшага ўздзеяння галосных пярэдняга рада на папярэднія зычныя (палаталізацыя напаўмяккіх зычных); храналогія гэтага працэсу і яго частковае адлюстраванне ў пісьмовых помніках XI – XII стст. Уплыў другаснага памякчэння зычных на далейшае збліжэнне зычных і галосных склада паводле зоны ўтварэння, з’яўленне памякчоных губных [б'], [п'], [м'], [в'] і зубных [д'], [т'], супадзенне другасна памякчоных [з'], [с'], [л'], [н'], [р'] з палатальнымі (спрадвечна мяккімі) [з'], [с'], [л'], [м'], [р']. Пашырэнне словаформаў з палатальнымі зычнымі.

Страта рэдукаваных. Знікненне рэдукаваных у слабай пазіцыі і вакалізацыя ў моцнай: [ъ] > [о], [ь] > [е]. Адхіленні ад гэтай заканамернасці і іх прычыны. Адлюстраванне страты рэдукаваных у пісьмовых помніках XI – XIII стст. Неаднолькавая храналогія працэсаў знікнення слабых і вакалізацыі моцных рэдукаваных. Неадначасовасць старты рэдукаваных у розных усходнеславянскіх дыялектах.

Лёс спалучэнняў [ъ] і [ь] з плаўнымі [р] і [л] паміж зычнымі. Гісторыя спалучэнняў тыпу *tъrt, з’ява другога поўнагалосся, яе дыялектны характар. Сляды гэтай з’явы ў сучаснай беларускай мове. Своеасабліваe развіццё спалучэнняў тыпу *trъt у асобных дыялектах і вынікі яго ў сучасных усходнеславянскіх мовах.

Гісторыя напружаных [ыˇ] і [иˇ] у моцнай і слабой пазіцыях. Неаднолькавае змяненне гэтых галосных у дыялектах і яго вынікі ў сучасных усходнеславянскіх мовах.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

Змяненні ў гукавой сістэме пад уздзеяннем страты рэдукаваных. Змяненне складовай структуры. Узнікненне новых закрытых складоў. Страта пазіцыйнай мены моцных і слабых рэдукаваных, пераўтварэнне яе ў чаргаванне [о] і [е] з нулём гука (бегласць галосных). Чаргаванні ўстаўных галосных з нулём гука. З'ява бегласці галосных па аналогіі. Чаргаванні пачатковага [і] з [ы] пасля страты рэдукаваных. З'яўленне разнастайных спалучэнняў зычных у складзе (неаднародных паводле зоны артыкуляцыі, размешчаных не па нарастаючай гучнасці, падвоеных зычных і інш.); асіміляцыйныя і дысіміляцыйныя змяненні ў гэтых спалучэннях зычных. Змяненне складовай мяжы пры словазмяненні і словаўтварэнні. Магчымасць міжскладовых пазіцыйных змяненняў. Падаўжэнне галосных [о] і [е] у новых закрытых складах ва ўкраінскай мове і некаторых гаворках беларускай мовы.

6. Фанетычныя змяненні на грунце асобных усходнеславянскіх моў. Працэс прымнажэння рыс, спецыфічных для асобных дыялектных груп, і фарміраванне гукавой сістэмы беларускай мовы.

Карэляцыя зычных па цвёрдасці – мяккасці як асноўная тэндэнцыя развіцця беларускай фанетычнай сістэмы. Магчымасць парнага супрацьпастаўлення цвёрдых – мяккіх зычных пасля другаснага памякчэння (да страты рэдукаваных); роля страты рэдукаваных у станаўленні сучаснай катэгорыі суадносных па цвёрдасці – мяккасці зычных (у становішчы на канцы слова і перад зычнымі).

Змяненне груп [гы], [кы], [хы] у [г'и], [к'и], [х'и] і яго адносіны да гісторыі парнага супрацьпастаўлення цвёрдых – мяккіх зычных.

Асіміляцыйнае памякчэнне і зацвярдзенне зычных перад зычнымі. З'яўленне перакрыжаванага тыпу пазіцыйнай мены зычных, парных па цвёрдасці – мяккасці. Афармленне суадноснага рада цвёрдых і мяккіх зычных. Значнае павелічэнне колькасці зычных, абумоўленае развіццём суадноснасці па цвёрдасці – мяккасці.

Спецыфічныя з'явы ў развіцці карэляцыі цвёрдых – мяккіх зычных у беларускай мове параўнальна з іншымі ўсходнеславянскімі мовамі.

Зацвярдзенне губных на канцы слова і перад зычнымі ў беларускай мове.

Гісторыя зычных, няпарных па цвёрдасці – мяккасці. Зацвярдзенне шыпячых і [ц] у беларускай мове. Дыялектныя адрозненні ў вымаўленні шыпячых і [ц]. Развіццё афрыкаты [дж] у беларускай мове; тлумачэнне гэтай з'явы і яе храналогія. Зацвярдзенне [р] у беларускай мове. Своеасаблівае памякчэнне [д] і [т] у беларускай мове (дзеканне і цеканне).

Канчатковае афармленне пасля страты рэдукаваных суадноснага рада зычных, парных па звонкасці – глухасці. Прыпадабненне глухіх зычных да звонкіх перад звонкімі. Прыпадабненне звонкіх зычных да глухіх перад глухімі. Аглушэнне звонкіх зычных на канцы слова. Пытанне аб часе

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

ўзнікнення гэтых працэсаў і асаблівасцях іх працякання ў розных умовах перад зычнымі і на канцы слова. З’яўленне перакрыжаванага тыпу пазіцыйнай мены парных глухіх і звонкіх зычных.

Спецыфічныя з’явы ў станаўленні суадносных радоў парных звонкіх – глухіх зычных у беларускай мове параўнальна з іншымі ўсходнеславянскімі мовамі.

Гісторыя [ў] (у нескладовага). Умовы з’яўлення ў на месцы [в], [л]. Пераход [л] у [ў] паводле граматычнай аналогіі. Гук [ў] у беларускай і ўкраінскай мовах; аглушэнне [в] у [ф], [в'] у [ф'] перад глухімі зычнымі і на канцы слова ў рускай мове.

Асаблівасці развіцця [г] у беларускай мове.

Асіміляцыйныя і дысіміляцыйныя змяненні ў новых (узнікшых пасля страты рэдукаваных) групах зычных у беларускай мове. Прыпадабненне свісцячых зычных да шыпячых і шыпячых зычных да свісцячых. Спрашчэнне новых груп зычных у выніку розных, пераважна асіміляцыйных, працэсаў.

Лёс спалучэнняў “санорны + шумны зычны” ў пачатку слова ў беларускай мове (з’яўленне пратэтычных галосных [а], [і]).

Развіцце падвоеных і падоўжаных зычных. Падваенне зычных (галоўным чынам на стыку марфем) ва ўсіх усходнеславянскіх мовах. Фанетычнае падаўжэнне зычных у беларускай і ўкраінскай мовах.

Своеасаблівае развіццё пратэтычных зычных [в], [г] у беларускай мове.

Гісторыя галоснага, што абазначаўся літарай ѣ (яць). Змяненне гэтага галоснага ў розных усходнеславянскіх дыялектах (у [ê] або [іе]). Паступовае развіццё яго ў беларускай і рускай мовах у галосны [е]. Выкарыстанне літары ѣ на пісьме ў дакастрычніцкі час.

Змяненне [е] > [о] у становішчы пасля мяккага зычнага перад цвёрдым. Пытанне аб часе і ўмовах узнікнення гэтай з’явы. Характар яе сувязі з працэсам страты рэдукаваных і спецыфіка ў розных усходнеславянскіх літаратурных мовах і дыялектах.

Фаналагізацыя адносін паміж гукамі [е] і [о] на канцы слова і паміж мяккімі зычнымі. Афармленне супрацьпастаўлення галосных ‹е› – ‹о› па нелабіялізаванасці – лабіялізаванасці.

Памяншэнне колькасці галосных фанем, кампенсаванае развіццём суадносных пар цвёрдых і мяккіх зычных. Устанаўленне сучаснай пяціфанемнай сістэмы вакалізму ў беларускай мове.

Гісторыя акання. Агульнае паняцце праакнне і яго тыпы. Гіпотэзы адносна прычын і часу ўзнікнення акання, тэрыторыі, на якой яно першапачаткова развівалася. Адлюстраванне акання ў помніках пісьменства (прамое і гіпернармальнае). Аканне (яканне) як норма сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

## Марфалогія

1. Прадмет і задачы гістарычнай марфалогіі як часткі навукі аб развіцці граматычнага ладу мовы.

2. Агульная характарыстыка марфалагічнага ладу старажытных ўсходнеславянскіх гаворак. Сродкі ўтварэння слоў і словаформаў, гістарычная сувязь словазмянення і словаўтварэння. Дыяхранічныя сувязі фанетыкі і граматыкі. Адносіны марфемнага члянення слоў да гукавога ладу. Марфалагізацыя старажытных фанетычных чаргаванняў (выкарыстанне іх у якасці марфалагічнага сродку словаўтварэння і словазмянення). Пераўтварэнне старажытных чаргаванняў у выніку змяненняў фанетычных нормаў, узнікнення новых чаргаванняў і выкарыстанне іх як марфалагічнага сродку; выпадкі адсутнасці чаргавання, абумоўленыя дзеяннем граматычнай аналогіі.

3. Часціны мовы як марфалагічныя падсістэмы, узаемазвязаныя і адносна аўтаномныя ў сваёй гісторыі. Размежаванне часцін мовы ў старажытныя часы. Супрацьпастаўленне імені і дзеяслова ў сістэме паўназначных часцін мовы. Ступень дыферэнцыяцыі розных часцін мовы ў межах імені.

4. Назоўнік. Універсальныя (род, лік, склон) і неўніверсальныя (зборнасць, асоба, адушаўлёнасць/неадушаўлёнасць) катэгорыі назоўнікаў.

Род як асноўная класіфікацыйная граматычная катэгорыя назоўнікаў. Прычыны хістанняў у граматычным родзе назоўнікаў. Адносіны граматычнага роду назоўнікаў да іх размеркавання па тыпах скланення.

Гісторыя катэгорыі ліку і зборнасці. Страта парнага ліку ў выніку развіцця граматычнай супрацьпастаўленасці адзіночнага і множнага лікаў. Рэшткі парнага ліку ў сучаснай беларускай мове.

Адметнасці ўжывання назоўнікаў са значэннем асобы ў агульнаўсходнеславянскіх помніках пісьменства. Гісторыя катэгорыі адушаўлёнасці/неадушаўлёнасці назоўнікаў (формаў вінавальнага склону).

Мнагатыпнасць скланення назоўнікаў. Умоўнае абазначэнне тыпаў скланення ў залежнасці ад характару індаеўрапейскіх іменных асноў (на падставе гукаў, якімі калісьці заканчвалася аснова слова).

Змены ў скланенні назоўнікаў. Страта старых клічных формаў. Рэлікты старой клічнай формы ў беларускай мове. З'яўленне новай клічнай формы ў эмфатычным ужыванні (з асаблівым напружаннем у вымаўленні) ў некаторых усходне-славянскіх гаворках (*мам! Вань!*). Адлюстраванне ў пісьмовых помніках працэсу разбурэння старажытных (праславянскіх) тыпаў скланення, сфарміраваных на базе індаеўрапейскіх іменных асноў. Праблематычнасць рэгулярнасці скланенняў на *зычныя* і на **й* ва ўсходнеславянскіх гаворках перыяду найбольш ранніх пісьмовых помнікаў.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

Перагрупоўка тыпаў скланення назоўнікаў у адзіночным ліку. Значэнне катэгорыі роду ў працэсе гэтай перагрупоўкі. Аб'яднанне ў адным тыпе скланення (так званым *мужчынскім*) назоўнікаў мужчынскага роду, акрамя назоўнікаў з былымі асновамі на **ā/jā*. Страта старажытнага скланення на **ŭ* як асобнага тыпу і захаванне некаторых яго склонавых формаў у скланенні назоўнікаў з былымі асновамі на **ŏ/jŏ*. Уніфікацыя словазмянення назоўнікаў ніякага роду на базе скланення назоўнікаў з былымі асновамі на **ŏ/jŏ*. Разбурэнне скланення на *зычныя* (пераход назоўнікаў з асновамі на *зычныя* ў іншыя тыпы скланення). Рэлікты старажытнага скланення на *зычныя* ў сучаснай беларускай мове. Разбурэнне скланення назоўнікаў жаночага роду на **ū* з асновай ускосных склонаў на *-в*. Змены ў скланенні на **ĭ* (пераход назоўнікаў мужчынскага роду ў скланенне на **jŏ*). Сучасная тыпалогія скланення назоўнікаў і яе адносіны да старажытных тыпаў іменнага скланення.

Узаемадзеянне цвёрдай і мяккай разнавіднасцей скланення. Гісторыя склонавых формаў назоўнікаў на заднеязычныя. Змены ў канчатках назоўнікаў у назоўным склоне множнага ліку. Гісторыя формаў роднага склону ў множным ліку. Уніфікацыя формаў давальнага, творнага і меснага склонаў множнага ліку назоўнікаў усіх трох родаў. Страта назоўнікамі адрознення па тыпах скланення ў множным ліку.

5. Займеннік. Сістэма займенных слоў старажытнага перыяду. Разрады займеннікаў і марфалагічныя асаблівасці некаторых разрадаў (адсутнасць катэгорый роду і ліку). Сінтаксічная і марфалагічная супрацьпастаўленасць асабовых (і зваротнага) і неасабовых займеннікаў. Словаўтварэнне займеннікаў. Скланенне асабовых і зваротнага займеннікаў. Асаблівасці ўжывання формаў 1-й асобы ў назоўным склоне адзіночнага ліку (*азъ, "зъ, "*). Суплетывізм асноў асабовых займеннікаў; традыцыйнакніжныя і ўласна ўсходнеславянскія адрозненні асобных склонавых формаў (*мънѣ – мьнѣ, тебѣ – тобѣ, себѣ – собѣ*). Энклітычныя формы, характэрныя для кніжнапісьмовай мовы, і адсутнасць іх рэфлексаў у сучасных усходнеславянскіх гаворках.

Гісторыя займенніка 3-й асобы. Абагульненне ў беларускай мове асновы назоўнага склону займенніка 3-й асобы з ускоснымі (*jон, jано* – як *jаго, jаму, jaje, joj* і г.д.). Граматычная адметнасць гэтага займенніка сярод іншых асабовых займеннікаў, абумоўленая яго паходжаннем з указальнага займенніка: захаванне катэгорыі роду і змяненне па так званым займенным скланенні, адсутнасць суадноснага прыналежнага займенніка (развіццё яго ў гаворках: *ягоны, іхні* і г.д.).

Скланенне неасабовых займеннікаў (займеннае скланенне) у старажытныя часы. Асаблівасці марфалагічнага выражэння родавых адрозненняў у гэтых займенніках.

Змены ў складзе неасабовых займеннікаў.

Гісторыя склонавых формаў неасабовых займеннікаў. Страта родавых адрозненняў у множным ліку і асаблівасці абагульнення

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

канчаткаў назоўнага і вінавальнага склонаў неасабовых займеннікаў у беларускай мове. Узаемадзеянне цвёрдай і мяккай разнавіднасцей скланення. Развіццё формаў тыпу *той* у родным і творным склонах адзіночнага ліку жаночага роду (на месцы *тоһ, тою).* Абагульненне формаў творнага і меснага склонаў адзіночнага ліку ў беларускай мове як вынік больш паслядоўнага праяўлення агульнай тэндэнцыі да уніфікацыі склонавых формаў займеннікаў. Развіццё членных (поўных) формаў займеннікаў тыпу *той, тая, тое, нашая, нашыя* і г.д. Гісторыя скланення займеннікаў *къто, чьто*. Пытанне аб паходжанні [г] у займенніку *гэты (гэтая* і г.д.). Пытанне аб прычынах адсутнасці [н] у беларускіх формах тыпу *аб ім* (руск. *о нем), пры ёй* (руск. *при ней)* і г.д. Іншыя спецыфічныя з’явы ў фанетычным развіцці формаў займеннікаў у беларускай мове.

6. Прыметнік. Асноўныя катэгорыі прыметніка як адной з груп імёнаў і іх адрозненне ад адпаведных катэгорый назоўніка. Разрады прыметнікаў па значэнні. Сістэма формаў якасных прыметнікаў. Адносныя (суфіксальныя) прыметнікі. Папаўненне за іх кошт якасных прыметнікаў. Прыналежныя прыметнікі, іх словаўтваральная сінаніміка.

Іменныя (кароткія) і займенныя (поўныя) прыметнікі. Заканамернасці функцыянавання тых і другіх формаў прыметнікаў у старэйшых помніках усходнеславянскага пісьменства.

Скланенне іменных прыметнікаў. Ранняя страта іменных формаў адноснымі прыметнікамі. Ужыванне іменных формаў якасных прыметнікаў у прэдыкатыўнай функцыі і страта імі ўскосных склонаў. Працэс уніфікацыі родавых канчаткаў у множным ліку. Выпадкі ўжывання іменных формаў якасных прыметнікаў у сучаснай беларускай мове. Пазнейшае пранікненне займенных формаў у скланенне прыналежных прыметнікаў. Ужыванне прыналежных прыметнікаў у беларускай мове ва ўскосных склонах у займенных формах.

Гісторыя займенных прыметнікаў. Адлюстраванне ў старэйшых помніках усходнеславянскага пісьменства працэсу пераўтварэння першапачатковых формаў займенных прыметнікаў; іх скланенне. Паступовае замацаванне займенных формаў у атрыбутыўнай функцыі і зближэнне іх з формамі неасабовых займеннікаў (страта родавых адрозненняў у множным ліку, абагульненне асобных склонавых формаў і г.д.). Пашырэнне ў беларускай мове займенных формаў і ў прэдыкатыўнай функцыі і паступовае выцясненне імі з ужытку іменных формаў.

Сцягнутыя (злітныя) формы прыметнікаў і іх гісторыя.

Гісторыя формаў ступеней параўнання прыметнікаў. Іменныя і займенныя формы ступеней параўнання. Замацаванне іменных формаў вышэйшай ступені ў прэдыкатыўнай функцыі з двухбаковай сінтаксічнай сувяззю (параўн. *ён дужэй за брата)* і страта імі катэгорый склону, роду і ліку. Асаблівасці ўжывання такіх формаў у беларускай мове. Пашырэнне ў беларускай мове дапасаваных формаў вышэйшай ступені займенных прыметнікаў (тыпу *вышэйшы дом, вышэйшага дома* і г.д.). Гісторыя

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

формаў найвышэйшай ступені. Развіццё апісальных (аналітычных) формаў ступеней параўнання прыметнікаў і асаблівасці іх ужывання ў беларускай мове.

7. Фарміраванне лічэбніка як часціны мовы. Лічыльныя словы ў найбольш ранніх помніках усходнеславянскага пісьменства. Сувязь гэтых слоў з рознымі класамі імёнаў – назоўнікамі, прыметнікамі, займеннікамі. Асаблівасці скланення асобных груп лічыльных слоў. Складаныя і састаўныя лікавыя назвы (11 і далей) і іх паходжанне.

Працэс семантычнага пераўтварэння лічыльных слоў у назвы адцягненых лікаў ( колькасныя лічэбнікі) і звязаныя з ім граматычныя змены ў гэтых словах: нейтралізацыя граматычных катэгорый роду і ліку, уніфікацыя скланення ўнутры асобных груп (2 – 4, 5 – 10 і далей), абагульненне сінтаксічнай спалучальнасці з назоўнікамі і інш. Сувязь перабудовы скланення лічыльных слоў і фарміраванне катэгорыі лічэбніка як асобнай часціны мовы са стратай парнага ліку. Спецыфічныя з’явы ў развіцці некаторых колькасных лічэбнікаў у беларускай мове.

Гісторыя парадкавых, дробавых і зборных лічэбнікаў, іх суадноснасць з іншымі часцінамі мовы і словаўтваральныя асаблівасці.

8. Дзеяслоў. Агульная характарыстыка спецыфічных катэгорый дзеяслова (лад, час, трыванне). Дапасавальныя катэгорыі ліку і асобы. Лексіка-граматычная катэгорыя стану. Спрагальныя і неспрагальныя формы дзеяслова.

Гісторыя спрагальных дзеяслоўных формаў.

Сістэма спрагальных формаў дзеяслова перад узнікненнем пісьменства ва ўсходніх славян. Асноўныя граматычныя катэгорыі старажытнага дзеяслова: трыванне, стан, час, лад, асоба. Сістэма формаў часу і трывання. Аўтаномнасць значэнняў трывання і часу ў перыяд найбольш ранніх усходнеславянскіх пісьмовых помнікаў. Пытанне аб ступені размежавання трыванняў у гэты перыяд. Структурныя сродкі такога размежавання. Простыя і складаныя (ана-літычныя) формы часу. Супрацьпастаўленасць рэальнага (абвеснага) ладу ірэальным, што не валодалі марфалагічным паказчыкам часавых значэнняў. Асаблівасці катэгорыі асобы і ліку спрагальных формаў. Адсутнасць граматычна выражанай дыферэнцыяцыі стану ў спрагальных формах.

Тыпы формаўтваральных дзеяслоўных асноў інфінітыва і цяперашняга часу. Тэматычныя і нетэматычныя асновы цяперашняга часу.

Класы дзеясловаў у старажытны перыяд.

Гісторыя трывальна-часавай сістэмы дзеяслова.

Гісторыя формаў цяперашняга (будучага простага) часу. Нетэматычнае спражэнне ў гісторыі беларускай мовы. Гісторыя тэматычнага спражэння. Зліццё тэматычных галосных з асабовымі канчаткамі і формаўтваральнымі суфіксамі. Асаблівасці развіцця формаў

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

тэматычнага спражэння (3-й асобы адзіночнага і множнага ліку і некаторых іншых) у беларускай мове.

Гісторыя формаў будучага часу. Дыферэнцыяцыя часавага значэння формаў цяперашняга часу незакончанага і закончанага трыванняў (марфалагічнае афармленне будучага простага часу). Развіццё фармальных сродкаў (афіксацыі) супрацьпастаўлення значэнняў цяперашняга і будучага простага часу. Дзве складаныя формы будучага часу старажытных усходнеславянскіх дзеясловаў: будучы першы (з інфінітывам) і будучы другі (ранейбудучы), іх значэнне і спосабы выражэння. Канкурэнцыя дапаможных дзеясловаў у спалучэнні з інфінітывам. Захаванне ў гаворках рэштак будучага першага часу з формамі дапаможнага дзеяслова *иму*. Разбурэнне будучага другога. Замацаванне дапаможнага дзеяслова *буду* пры інфінітыве і афармленме сучасных форм будучага складанага часу.

Гісторыя формаў прошлага часу. Сістэма формаў прошлага часу ў старэйшых помніках усходнеславянскага пісьменства: формы простыя (аорыст, імперфект) і складаныя (перфект, плюсквамперфект); іх утварэнне, спражэнне, часавае значэнне і адносіны да значэнняў трывання. Праблематычнасць імперфекта як часавай формы ва ўсходнеславянскіх дыялектах. Два рады формаў плюсквамперфекта. Распад старажытнай сістэмы прошлага часу ў сувязі з развіццём адрозненняў закончанага і незакончанага трыванняў. Розны лёс мнагачленнай сістэмы прошлага часу ў кніжнапісьмовай і ў вуснагутарковай мове. Ранняя страта гутарковай мовай простых формаў прошлага часу; сведчанне лінгвістычнай геаграфіі аб завяршэнні перабудовы старажытнай славянскай сістэмы формаў прошлага часу ва ўсходнеславянскіх гаворках да XVII ст. Пашырэнне функцый перфекта і пераўтварэнне форм на *-л-* ва універсальны выразнік агульнага значэння прошлага часу; сувязь гэтага працэсу са стратай дапаможнага дзеяслова *есмь*. Здольнасць формаў на *-л-*, утвораных ад асноў розных трыванняў, выражаць разнастайныя прыватныя значэнні прошлага часу. Гісторыя формаў плюсквамперфекта. Рэшткі яго ў сучасных гаворках і ў беларускай літаратурнай мове.

Гісторыя формаў ірэальных ладоў: загаднага і ўмоўнага.

Гісторыя іменных (неспрагальных) формаў дзеяслова.

Сістэма іменных формаў старажытнага дзеяслова: інфінітыў, супін, дзеепрыметнік; спецыфіка дзеяслоўных катэгорый у сістэме іменных формаў.

Гісторыя формаў інфінітыва і пашырэнне яго функцый.

Гісторыя супіна. Выцясненне яго інфінітывам у канструкцыях са значэннем мэты. Захаванне супіна ў некаторых гаворках.

Гісторыя формаў дзеепрыметніка. Утварэнне і скланенне іменных і займенных дзеепрыметнікаў незалежнага і залежнага стану цяперашняга і прошлага часу ў старажытных помніках пісьменства. Ужыванне іменных дзеепрыметнікаў незалежнага стану ў прэдыкатыўнай або

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

паўпрэдыкатыўнай функцыі (другараднага выказніка), праблематычнасць атрыбутыўнай функцыі іменных дзеепрыметнікаў на -*уч*, -*ач*- ва ўсходнеславянскіх гаворках. Дзеепрыметнікі залежнага стану як асноўны сродак афармлення пасіўных канструкцый (залежнага стану). Захаванне іменных дзеепрыметнікаў залежнага стану ў ролі выказніка ў пасіўных канструкцыях і страта гэтымі дзеепрыметнікамі формаў ускосных склонаў. Пашырэнне займенных дзеепрыметнікаў залежнага стану ў прэдыкатыўнай функцыі ў беларускай мове. Замацаванне іменных дзеепрыметнікаў незалежнага стану ў функцыі другараднага выказніка і паслабленне іх залежнасці ад дзейніка, страта імі формаў словазмянення і пераўтварэнне ў дзеепрыслоўі. Формаўтваральныя і сінтаксічныя рысы дзеепрыслоўяў, абумоўленыя іх гістарычнай сувяззю з дзеепрыметнымі формамі ў паўпрэдыкатыўнай функцыі. Асаблівасці развіцця дзеепрыметных формаў у дзеепрыслоўі ў беларускай мове. Заняпад займенных дзеепрыметнікаў, акрамя форм прошлага часу залежнага стану і незалежнага стану на -*л*, і абмежаванне іх ва ўжытку. Ад’ектывацыя (пераход у прыметнікі) займенных дзеепрыметнікаў.

9. Прыслоўе. Асаблівасці фарміравання прыслоўя як часціны мовы. Падзел старажытных усходнеславянскіх прыслоўяў паводле ўтварэння і значэння. Ступені параўнання прыслоўяў. Змены ў сістэме прыслоўя на працягу развіцця беларускай мовы.

10. Службовыя словы (прыназоўнікі, злучнікі, часціцы) у гісторыі беларускай мовы.

11. Выклічнікі і іх гісторыя.

## Сінтаксіс

1. Прадмет і задачы гістарычнага сінтаксісу. Сувязь паміж зменамі сінтаксічнымі і марфалагічнымі. Метады гістарычнага даследавання сінтаксічных з’яў. Асаблівасці інтэрпрэтацыі гісторыі сінтаксічных з’яў вуснага маўлення на падставе сведчанняў пісьмовых помнікаў.

2. Асноўныя тыпы простых сказаў у помніках усходнеславян-скага пісьменства (сказы апавядальныя, пытальныя, пабуджальныя, клічныя, адмоўныя, двухсастаўныя і аднасастаўныя).

3. Гісторыя спосабаў выражэння членаў сказа.

Эліпсіс дзейніка як норма старажытнага (і сучаснага размоўнага) сказа ў звязным тэксце. Асаблівасці ўжывання асабовых займеннікаў у ролі дзейніка ў розныя перыяды ў сувязі з гісторыяй дзеяслоўных формаў. Назоўнікі зборнага значэння ў ролі дзейніка і дапасаванне да яго выказніка.

Выказнік як абавязковы член старажытнага сказа.

Просты выказнік і спосабы яго выражэння.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

Асаблівасці іменнага выказніка: выражэнне іменнай часткі, дапасаванне яе да дзейніка, ужыванне звязкі, выражанай дзеясловам *быти* ў форме цяперашняга часу. Гістарычныя змены ў спосабах выражэння іменнага выказніка: развіццё творнага прэдыкатыўнага на месцы другога назоўнага склону (назоўнікаў і прыметнікаў), паступовая страта звязкі, выражанай дзеясловам *быти* ў форме цяперашняга часу, пашырэнне займенных (поўных) формаў прыметнікаў і дзеепрыметнікаў у беларускай мове.

Дзеепрыметнікі незалежнага стану ў ролі іменнай часткі выказніка і ў ролі дададзенага, другараднага выказніка. Афармленне дзеепрыслоўяў як спецыялізаванай формы з паўпрэдыкатыўнай функцыяй. Развіццё сказаў з дзеепрыслоўнымі зваротамі. Гісторыя пасіўных канструкцый (суадносіны дзеепрыметнікаў залежнага стану і зваротных дзеясловаў у розныя перыяды развіцця беларускай мовы).

Гісторыя суадносных канструкцый з прыналежнымі прыметнікамі (тыпу *судь Ярославль*) і з родным склонам назоўнікаў (тыпу *судь Ярослава*). Параўнальна шырокае ўжыванне ў беларускай мове прыналежных прыметнікаў у ролі дапасаванага азначэння.

Змены ў формах дапасавання: выцясненне постпазіцыйнага дапасаванага азначэння ў нейтральных канструкцыях прэпазіцыйным; дапасаванне азначэнняў і выказнікаў да зборных назоўнікаў у форме адзіночнага ліку: замена канструкцый з другімі (двайнымі) ускоснымі склонамі (двайным родным, двайным давальным) прэдыкатыўнымі канструкцыямі з творным склонам у сувязі з пашырэннем функцый творнага склону.

Асаблівасці старажытнага ўсходнеславянскага кіравання. Суадносіны склонавых формаў з прыназоўнікамі і без прыназоўнікаў пры дзеясловах. Змена ў кіраванні дзеясловаў прыназоўнікавымі і беспрыназоўнікавымі склонавымі формамі. Пашырэнне сістэмы прыназоўнікавых канструкцый. Абагульненне прыназоўнікаў у выпадку, калі яны паўтараліся пры аднародных членах сказа, а таксама пры назоўніках і дапасаваных да іх азначэннях (тыпу *съ побѣдою и съ славою – з перамогай і славай, на рѣцѣ на Каялѣ – на рацэ Каяле*).

Змены ў сінтаксічных функцыях інфінітыва і ў спалучэнні з ім залежных склонаў.

Давальны самастойны і яго адносіны да жывога маўлення ўсходніх славян.

4. Развіццё розных тыпаў простых сказаў у беларускай мове. Змены ў суадносінах асабовых і безасабовых дзеяслоўных сказаў. Пашырэнне відаў безасабовых сказаў. Няпэўна- і абагульнена-асабовыя сказы ў пісьмовых помніках розных гістарычных перыядаў. Гісторыя намінатыўных сказаў. Змены ў структуры адмоўных сказаў.

5. Праблема складанага сказа ва ўсходнеславянскіх гаворках старэйшай пары (невыразная ў шматлікіх выпадках расчлянёнасць

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

сэнсавых адносін у складаных сінтаксічных адзінках і слаба выражаная граматычная сувязь паміж іх часткамі).

Гісторыя бяззлучнікавых складаных сказаў.

Складаназлучаныя і складаназалежныя сказы і іх сінтаксічнае падабенства ў помніках усходнеславянскага пісьменства, адсутнасць выразнага размежавання паміж галоўнай і залежнай часткамі складаных сказаў. Сродкі злучэння і падпарадкавання ў складаных сказах.

Асноўныя тэндэнцыі ў развіцці складаназлучаных сказаў.

Развіццё новых сродкаў выражэння падпарадкавальнай сувязі і фарміраванне сучасных тыпаў складаназлучаных сказаў.

Складаныя сказы са злучэннем і падпарадкаваннем у гісторыі беларускай мовы.

6. Змены ў спосабах і сродках перадачы простай і няўласна-простай мовы, у асаблівасцях парадку слоў у сказах і іншыя працэсы ў гісторыі сінтаксічнага ладу беларускай мовы.

## Лексікалогія

1. Прадмет і задачы гістарычнай лексікалогіі, яе непасрэдная сувязь з дыяхранічным словаўтварэннем.

2. Слоўнікавы склад як найбольш рухомы ўзровень мовы. Паступовае папаўненне слоўніка ў выніку змен у жыцці грамадства. Словаўтварэнне і запазычанне як асноўныя шляхі ўзбагачэння слоўнікавага складу. Іншыя шляхі папаўнення слоўніка (пераасэнсаванне існуючых слоў і г.д.). Архаізацыя і знікненне асобных слоў і цэлых лексічных мікрасістэм у сувязі з рознымі гістарычнымі пераўтварэннямі.

3. Фарміраванне старажытнай усходнеславянскай лексікі на базе агульнаславянскага лексічнага фонду. Яе асноўныя храналагічныя пласты (індаеўрапейская спадчына і праславянскія новаўтварэнні і запазычанні, агульнаўсходнеславянская і мясцовая лексіка) і тэматычныя мікрасістэмы (лексіка вытворча-гаспадарчая, грамадска-палітычная, юрыдычная, вайсковая, сямейна-бытавая і інш.).

4. Папаўненне лексікі шляхам словаўтварэння. Словаўтваральныя сродкі, атрыманыя ў спадчыну ад папярэдніх эпох. Асноўныя афіксы (суфіксы і прэфіксы) імён і дзеясловаў. Пераход слоў з адной часціны мовы ў другую: субстантывацыя прыметнікаў і дзеепрыметнікаў, утварэнне прыслоўяў са склонавых формаў і прыназоўнікавых канструкцый, службовых слоў з паўназначных.

5. Найбольш старадаўнія ўсходнеславянскія запазычанні з германскіх, балтыйскіх, фіна-ўгорскіх, іранскіх, цюркскіх і іншых моў. Пранікненне ва ўсходнеславянскія гаворкі царкоўнаславянізмаў і грэцызмаў у сувязі з пашырэннем хрысціянства (X–XI стст.).

Асаблівасці старажытнай анамастыкі (тапанімікі і антрапанімікі). Асваенне народнай гаворкай хрысціянскіх імёнаў.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

6. Развіццё слоўнікавага складу ў сувязі з фарміраваннем асобных усходнеславянскіх моў. Захаванне ўсходнеславянскімі мовамі агульнага лексічнага фонду і з'яўленне вялікай колькасці інавацый. Складванне ў беларускай мове спецыфічнага лексічнага пласта (уласнабеларускай лексікі) пад уздзеяннем розных інтра- і экстралінгвістычных фактараў.

Найбольш важныя словаўтваральныя працэсы ў гісторыі беларускай мовы. Дээтымалагізацыя, перараскладанне асноў і іншыя змены ў структуры асобных слоў, дзякуючы якім узбагачаліся словаўтваральныя сродкі. Агульнасць і адметнасць працэсаў папаўнення лексікі на базе наяўнага матэрыялу ў беларускай мове параўнальна з іншымі ўсходнеславянскімі мовамі.

Лексічныя кантакты беларускай мовы з іншымі мовамі, асабліва з польскай (XVI – XVIII стст.), і значэнне гэтых кантактаў для развіцця слоўніка беларускай мовы. Узмацненне рускага лексічнага ўплыву на беларускую мову пасля далучэння Беларусі да Расійскай імперыі ў канцы XVIII ст.

Асаблівасці фанетычнай і марфалагічнай адаптацыі лексічных запазычанняў народнай гаворкай.

7. Асноўныя тэндэнцыі ў развіцці слоўніка беларускай мовы ў XIX – XX стст. "Аблітаратурванне" дыялектнай і прастамоўнай лексікі ў сувязі з развіццём беларускай літаратурнай мовы на народна-гутарковай аснове. Нівеліруючае ўздзеянне літаратурнай лексікі на дыялектную і паступовая архаізацыя пэўных яе сродкаў. Развіццё слоўнікавага складу беларускай мовы на ўласнай базе і ў выніку міжмоўных кантактаў. Змены ў складзе традыцыйных для беларускай мовы лексічных пластоў і папаўненне яе новымі словамі і зваротамі. Станоўчыя і адмоўныя вынікі ўздзеяння рускай мовы на лексічную сістэму і словаўтваральныя магчымасці беларускай мовы. Тэндэнцыя далейшага развіцця і ўзбагачэння беларускай лексікі.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

# Літаратура

*Абабурка, М. В.* Параўнальная граматыка беларускай і рускай моў / М. В. Абабурка. – Мінск, 1992. – 224 с.

*Анічэнка, У. В.* Гістарычная лексікалогія ўсходнеславянскіх моў / У. В. Анічэнка. – Гомель, 1978. – 94 с.

*Анічэнка, У. В.* Мовы ўсходніх славян / У. В. Анічэнка. – Мінск, 1989. – 319 с.

*Борковский, В. И.* Историческая грамматика русского языка / В. И. Борковский, П. С. Кузнецов. – 2-е изд. – М.,1965. – 555 с.

*Булыка, А. М.* Гістарычная марфалогія беларускай мовы / А. М. Булыка, А. І. Жураўскі, І. І. Крамко. – Мінск, 1979. – 328 с.

Гістарычная лексікалогія беларускай мовы / пад рэд. А. І. Жураўскага. – Мінск, 1970. – 339 с.

*Горшкова, К. В.* Историческая грамматика русского языка / К. В. Горшкова, Г. А. Хабургаев. – М., 1981. – 359 с.

*Карский, Е. Ф.* Белорусы: Язык белорусского народа / Е. Ф. Карский. – М., 1955. – Вып. 1. – 475 с.; 1956. – Вып. 2-3. – 518 с.

*Мечковская, Н.Б.* Общее языкознание: Сущность и история языка / Н. Б. Мечковская, Б. А. Плотников, А. Е. Супрун. – 2-е изд. – Мінск, 1993. – 287 с.

Мова беларускай пісьменнасці XIV–XVIII стст. / пад рэд. А. І. Жураўскага. – Мінск, 1988. – 319 с.

*Стеценко, А. Н.* Исторический синтаксис русского языка / А. Н. Стеценко. – М., 1972. – 360 с.

*Янкоўскі, Ф. М.* Гістарычная граматыка беларускай мовы / Ф. М. Янкоўскі. – 3-е выд. – Мінск, 1989. – 301 с.

*Янович, Е. И.* Историческая грамматика русского языка / Е. И. Янович. – Мінск, 1986. – 319 с.

*Анічэнка, У. В.* Гістарычная граматыка беларускай мовы. Зборнік практыкаванняў / У. В. Анічэнка, М. Р. Прыгодзіч. – Мінск, 1999. – 220 с.

*Булахаў, М. Г.* Практыкаванні і матэрыялы па курсу гісторыі беларускай мовы / М. Г. Булахаў. – 2-е выд. – Мінск, 1969. – 180 с.

*Памецька, Н. К.* Гістарычная марфалогія беларускай мовы: практыкум / Н. К. Памецька. – Гродна, 2002. – 225 с.

Хрэстаматыя па гісторыі беларускай мовы / пад рэд. А. І. Жураўскага. – Мінск, 1961. – Ч. 1. – 539 с.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

# Частка II. ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ МОВЫ

## Тлумачальная запіска

Гісторыя беларускай літаратурнай мовы як філалагічная дысцыпліна з'уляецца састаўной часткай агульнага курса гісторыі беларускай мовы.

У адрозненне ад гістарычнай граматыкі, што вывучае, як у працэсе гістарычнага развіцця складвалася фанетычная сістэма, граматычны лад і слоўнік беларускай мовы, як у выніку паступовых змен, што адбываліся ў вуснай і пісьмовай мове, праходзіла станаўленне сучаснага якаснага стану мовы, у курсе гісторыі беларускай літаратурнай мовы разглядаюцца тыя змены і працэсы, якія адбываліся менавіта ў літаратурнай мове, г.зн. у мове агульнанароднай, апрацаванай і творча развітай мастакамі слова, дзеячамі культуры і навукі.

Асноўная задача курса – у цеснай сувязі з гісторыяй беларускага народа, гісторыяй культуры і літаратуры раскрыць вытокі беларускай літаратурнай мовы, гісторыю яе фарміравання і развіцця ад старажытнасці да нашых дзён. Таму праграма прадугледжвае пры асвятленні шляхоў фарміравання, развіцця і ўдасканалення беларускай літаратурнай мовы асэнсаванне таго, як складваліся ў розныя гістарычныя перыяды яе суадносіны з іншымі мовамі (у першую чаргу з царкоўнаславянскай, польскай, украінскай, рускай) і народнымі гаворкамі, як фарміраваліся і чым вызначаліся яе функцыянальна-стылявыя разнавіднасці і якую ролю яны адыгрывалі ў развіцці і станаўленні літаратурнай мовы, як паступова выпрацоўваліся і ўпарадкаваліся яе нормы.

Развіццё кожнай мовы мае свае спецыфічныя заканамернасці, якімі абумоўлены характар тых ці іншых працэсаў у яе развіцці. Таму ў праграме значная ўвага надаецца сацыяльным фактарам, што самым непасрэдным чынам уплывалі на працэсы фарміравання і функцыянавання мовы беларускай народнасці, развіццё беларускай літаратурнай мовы ў перыяд Вялікага княства Літоўскага, у часы Рэчы Паспалітай, пасля далучэння Беларусі да Расіі, у савецкія і постсавецкія гады, што вызначаюць характар моўнай палітыкі ў сучаснай Беларусі, асаблівасці беларуска-рускага двухмоўя.

Тэарэтычныя звесткі па гісторыі беларускай літаратурнай мовы прадугледжаны праграмай у такім аб'ёме, засваенне якога паслужыць трывалай асновай для авалодання практычнымі ўменнямі і навыкамі аналізу пісьмовых помнікаў XI-XX стст. розных функцыянальна-стылявых разнавіднасцей (стыляў).

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

# Уводзіны

1. Гісторыя літаратурнай мовы як асобная лінгвістычная дысцыпліна гістарычнага цыкла аб фарміраванні і функцыянаванні ў розныя гістарычныя перыяды замацаванай у літаратуры нармалізаванай пісьмовай разнавіднасці мовы народа. Прадмет і задачы курса гісторыі беларускай літаратурнай мовы.

Паняцце літаратурнай мовы і гістарычная зменлівасць яго зместу ў розныя эпохі развіцця грамадства. Нарматыўна-стылістычны падыход да моўных з'яў пры вывучэнні гісторыі літаратурнай мовы. Гістарычнасць літаратурна-моўнай нормы; праблема кадыфікацыі нормы. Паняцце стылістычнай сістэмы літаратурнай мовы ў гістарычным аспекце. Суадносіны паняццяў "літаратурная мова" і "мова мастацкай літаратуры", "стыль мовы" і "індывідуальны стыль" ("стыль пісьменніка", "стыль твора") у гісторыі літаратурнай мовы.

Адносіны курса гісторыі беларускай літаратурнай мовы да курса гістарычнай граматыкі і іншых раздзелаў навукі аб беларускай мове; яго месца сярод тых лінгвістычных дысцыплін, што вывучаюць ужыванне мовы (у адрозненне ад іншых лінгвістычных дысцыплін, якія вывучаюць лад мовы).

Культурна-пазнавальнае і навукова-практычнае значэнне курса гісторыі беларускай літаратурнай мовы для падрыхтоўкі спецыялістаў-філолагаў, для вывучэння мовы і літаратуры ў сярэдняй школе.

2. Сувязь гісторыі літаратурнай мовы з гісторыяй народа, яго культуры і літаратуры. Непасрэдная абумоўленасць перыядызацыі гісторыі беларускай літаратурнай мовы найбольш важнымі падзеямі ў грамадска-культурным жыцці беларускага народа. Вылучэнне ў гісторыі беларускай літаратурнай мовы трох асноўных храналагічных зрэзаў (перыядаў): 1) XI – пачатак XIV ст. – часы, з якіх пачынаецца літаратурна-моўная гісторыя ўсходніх славян (рускіх, украінцаў і беларусаў); 2) XIV – XVIII стст. – часы фарміравання і развіцця старабеларускай літаратурнай мовы; 3) XIX – XX стст., на працягу якіх склалася новая (сучасная) беларуская літаратурная мова як кадыфікаваная (нармалізаваная) сістэма. Праблема вылучэння асобных этапаў унутры асобных перыядаў у гісторыі беларускай літаратурнай мовы.

3. Крыніцы вывучэння гісторыі беларускай літаратурнай мовы. Творы (тэксты) розных жанраў старажытнай і сучаснай беларускай літаратуры (у шырокім сэнсе) як галоўная з гэтых крыніц; прынцыпы адбору і прыёмы навуковай інтэрпрэтацыі іх. Іншыя крыніцы (філалагічныя распрацоўкі розных часоў, выказванні сучаснікаў пра развіццё літаратурнай мовы на пэўным гістарычным этапе і г.д.).

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

4. Кароткія звесткі пра вывучэнне гісторыі беларускай літаратурнай мовы ў дакастрычніцкі і паслякастрычніцкі час і афармленне яе ў асобную галіну беларускага мовазнаўства. Асноўныя працы па гісторыі беларускай літаратурнай мовы і іх ацэнка.

## Літаратурная мова ўсходніх славян XI – пачатку XIV стст.

1. Сучасны стан пытання аб часе паяўлення пісьма на ўсходнеславянскіх землях, паходжанні літаратурнай мовы ўсходніх славян і ранніх этапах яе гісторыі. Традыцыйны погляд аб фарміраванні літаратурнай мовы ўсходніх славян на базе старaславянскай мовы шляхам паступовага напаўнення яе сродкамі жывога ўсходнеславянскага маўлення. Пашырэнне ў савецкі час погляду аб зараджэнні літаратурнай мовы ўсходніх славян на ўласнай моўнай аснове ў выніку ўзаемадзеяння яе з кніжнай старaславянскай мовай; вылучэнне ў сістэме літаратурнай мовы ўсходніх славян разнародных паводле паходжання стылістычных разнавіднасцей – тыпаў, або стыляў: а) кніжна-славянскага (паводле іншай тэрміналогіі – царкоўна-літаратурнага, царкоўна-кніжнага, кніжналітаратурнага) на старaславянскай аснове; б) народна-літаратурнага (інакш – свецка-літаратурнага), які вызначаўся складаным узаемадзеяннем народнай гаворкі ўсходніх славян і старaславянскай (царкоўнаславянскай) мовы; в) справаводнага (“дзелавога”), найбольш цесна звязанага з жывой усходнеславянскай гаворкай.

Меркаванне адносна паралельнага функцыянавання ў пісьменстве часоў Кіеўскай Русі дзвюх моў – царкоўнаславянскай (генетычна – старaславянскай) і набліжанай да жывога маўлення ўсходніх славян (старажытнарускай). Структурна-стылістычныя варыянты (лексічныя і граматычныя) у апошняй, абумоўленыя ўзаемадзеяннем у ёй царкоўнаславянскай і ўсходнеславянскай стыхій.

2. Грамадскія функцыі літаратурнай мовы ўсходніх славян старэйшай пары. Размежаванне пісьмовых помнікаў паводле іх моўнай асновы. Найбольшая распаўсюджанасць помнікаў на царкоўнаславянскай моўнай аснове. Уплыў царкоўнаславянскай мовы на тагачасную літаратурна-моўную творчасць усходніх славян, вядучая роля яе ў выпрацоўцы правапісна-граматычных нормаў, спосабаў і прыёмаў літаратурнага выказвання. Гістарычная абумоўленасць гэтай з’явы тагачаснымі сацыяльна-эканамічнымі і культурна-гістарычнымі фактарамі.

3. Характарыстыка мовы помнікаў усходнеславянскага пісьменства старэйшай пары – казанняў Іларыёна і Кірылы Тураўскага, жыційнай літаратуры, перакладных (з грэчаскай мовы) гістарычных аповесцей, твораў У.Манамаха, летапісаў, “Слова аб паходзе Ігаравым”, “Рускай праўды”, грамат і інш. Своеасаблівае месца так званых “дзелавых” помнікаў у

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

тагачасным пісьменстве; пы-танне аб правамернасці разгляду іх у гісторыі літаратурнай мовы. Адметнасць стылістычных адносін у літаратурнай мове ўсходніх славян старэйшай пары параўнальна з тымі, якімі характарызуюцца сучасныя ўсходнеславянскія літаратурныя мовы.

4. Пісьменства на тэрыторыі сучаснай Беларусі XI – XIII стст. Агляд найбольш каштоўных пісьмовых помнікаў, створаных тут у гэты час; нязначнасць у іх вузкамясцовых моўных рыс.

5. Утварэнне ў XII – XIII стст. на тэрыторыі Русі новых феадальных аб’яднанняў. Мясцовыя рысы ў пісьмовых помніках асобных рэгіёнаў як адлюстраванне працэсу складвання асобных усходнеславянскіх літаратурных моў.

## Старабеларуская літаратурная мова

1. Канцэпцыі этнагенезу беларусаў. Фарміраванне беларускай народнасці і яе мовы ў часы Вялікага княства Літоўскага.

2. Літаратурна-пісьмовыя помнікі XIV ст., створаныя на тэрыторыі сучаснай Беларусі, працяг у іх традыцый усходнеславянскага пісьменства папярэдніх часоў. Адлюстраванне ў помніках (асабліва ў полацкіх, віцебскіх, смаленскіх гандлёвых дагаворах і граматах) беларускіх моўных рыс. Пашырэнне гэтых рыс з цягам часу ў розных пісьмовых помніках.

3. Складванне старабеларускай літаратурнай мовы ў яе функцыянальна-стылістычных разнавіднасцях ва ўмовах фарміравання беларускай народнасці. Выпрацоўка і замацаванне ў пісьмова-літаратурнай практыцы XIV – XVII стст. граматычна-правапісных асаблівасцей старабеларускай літаратурнай мовы, спецыфічных сродкаў і прыёмаў літаратурнага выказвання. Папаўненне лексікі і фразеалогіі старабеларускай літаратурнай мовы на ўласнай базе, а таксама праз запазычанне з іншых моў (асабліва польскай). Паступовае паслабленне ў старабеларускай літаратурнай мове царкоўнаславянскага ўплыву і адмежаванне яе ад царкоўнаславянскай мовы. Абазначэнне сучаснікамі старабеларускай літаратурнай мовы назвамі “русский язык”, “русская мова”, пазней – “простая мова” (“простый русский диалект”) для адрознення яе ад іншых моў (г.зн. і ад царкоўнаславянскай).

Узнікненне і распаўсюджанне на Беларусі кнігадрукавання. Значэнне выдавецкай дзейнасці Ф.Скарыны, С.Буднага, В.Цяпінскага і іншых дзеячаў тагачаснай беларускай культуры для ўдасканалення сродкаў і прыёмаў літаратурнага выказвання, граматычна-правапіснага афармлення старабеларускай літаратурнай мовы, збліжэння яе з жывой гаворкай народа.

4. Грамадскія функцыі старабеларускай літаратурнай мовы ў Вялікім княстве Літоўскім і Рэчы Паспалітай і адносіны яе да літаратурнай мовы

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

ўкраінскай народнасці. Асноўныя этапы развіцця старабеларускай літаратурнай мовы.

5. Агульная характарыстыка структуры старабеларускай літаратурнай мовы на розных гістарычных этапах з пункту гледжання выкарыстання сродкаў жывой народнай гаворкі з яе дыялектнымі асаблівасцямі, захавання традыцый усходнеславянскага пісьменства (графічных, граматычна-правапісных, лексіка-стылістычных і г.д.), запазычання іншамоўных элементаў. Адсутнасць паслядоўнасці ў словаўжыванні, а таксама граматычна-правапісным афармленні помнікаў старабеларускага пісьменства; прычыны гэтай з'явы. Паняцце літаратурнай нормы ў дачыненні да старабеларускай літаратурнай мовы.

6. Функцыянальна-стылістычныя разнавіднасці старабеларускай літаратурнай мовы. Перабудова ў новых грамадскіх умовах атрыманай у спадчыну ад ранейшых часоў сістэмы стыляў і фарміраванне ў старабеларускай літаратурнай мове своеасаблівай сістэмы функцыянальна-стылістычных разнавіднасцей. Характарыстыка іх на матэрыяле разнастайных помнікаў пісьменства XIV – XVIII стст.

Асаблівасці мовы юрыдычна-дзелавых беларускіх помнікаў (у прыватнасці "Літоўскай метрыкі", "Літоўскага статута") і значэнне так званага "дзелавога" пісьменства для выпрацоўкі і замацавання фанетычных і граматычных рыс старабеларускай літаратурнай мовы, а таксама ўзбагачэння яе лексіка-фразеалагічных сродкаў.

Моўна-стылістычныя асаблівасці арыгінальнай і перакладной вершаванай і празаічнай мастацкай літаратуры, палітычнай сатыры, летапісаў, навуковай і гістарычна-мемуарнай прозы, палемічных твораў, перакладаў і арыгінальных помнікаў рэлігійнай літаратуры, а таксама іншых твораў XIV – XVIII стст., напісаных на так званай "рускай", або "простай", мове. Спецыфічныя ў розных помніках сродкі і прыёмы літаратурнага выказвання як праяўленне стылістычнай разнастайнасці старабеларускай літаратурнай мовы. Значэнне асобных твораў арыгінальнай і перакладной беларускай літаратуры ў гісторыі старабеларускай літаратурнай мовы.

7. Царкоўнаславянская кніжна-літаратурная мова (так званы "словенский", "славянороссий язык") на Беларусі ў XIV – XVIII стст.; сферы яе выкарыстання і паступовае ператварэнне ў культавую мову праваслаўнай царквы. Пытанне аб беларускай рэдакцыі царкоўнаславянскай мовы.

З'явы, звязаныя з так званым другім паўднёваславянскім уплывам (адраджэнне знікшых з ужытку славянізмаў і архаізмаў, павелічэнне колькасці лексічных і фразеалагічных новаўтварэнняў кніжнага тыпу, ускладненне сінтаксічных канструкцый, насычэнне твораў моўна-выяўленчымі сродкамі кніжнага паходжання, якія надавалі стылю выказвання незвычайную квяцістасць і павышаную экспрэсіўнасць,

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

новаўвядзенні ў графіцы, арфаграфіі і г.д.). Дадатныя і адмоўныя бакі гэтага ўплыву. Яго адлюстраванне ў помніках беларускага пісьменства.

Заняпад царкоўнаславянскай мовы на Беларусі ў перыяд знаходжання яе ў складзе Рэчы Паслалітай; прычыны гэтага заняпаду.

Роля царкоўнаславянскай мовы ў развіцці беларускай літаратурнай мовы.

Буквары і граматыкі XVI – XVII стст. і роля іх (асабліва граматыкі М.Сматрыцкага) ва ўстанаўленні норм літаратурна-кніжнай мовы і ў пазнейшай граматычнай распрацоўцы ўсходнеславянскіх моў. “Граматыка словенская” Івана Ужэвіча – першая спроба апісання старабеларускай літаратурнай мовы XVI-XVII стст. Лексікаграфічныя працы гэтага часу.

8. Пагаршэнне ўмоў для развіцця пісьменства на беларускай мове пасля Люблінскай уніі 1569 г. Шырокае нематываванае пранікненне ў творы беларускага пісьменства канца XVI – XVII стст. паланізмаў і лацінізмаў; выкарыстанне тагачаснымі беларускімі пісьменнікамі стылістычных прыёмаў польска-лацінскага пісьма. Заняпад пісьменства на беларускай мове пад канец XVII ст. у выніку ўзмацнення сацыяльнага і нацыянальна-рэлігійнага прыгнёту на Беларусі ў сувязі з наступіўшай панска-каталіцкай агрэсіяй. Барацьба беларускага народа супраць сацыяльнага і нацыянальна-рэлігійнага прыгнёту, за права карыстацца роднай мовай на пісьме.

Забарона польскімі ўладамі ў канцы XVII ст. выкарыстоўваць беларускую мову ў справаводстве. Паступовае выцясненне старабеларускай літаратурнай мовы з афіцыйнай перапіскі і іншых відаў пісьменства. Абмежаваная колькасць вядомых у наш час помнікаў, створаных на беларускай мове ў XVIII ст.

9. Беларускія інтэрмедыі XVII – XVIII стст. Характар выкарыстання ў гэтых творах жывой гаворкі беларускага народа. Адыход у іх ад традыцый старабеларускай літаратурнай мовы і зараджэнне новых формаў і прыёмаў літаратурнага выказвання.

10. Канчатковы заняпад старабеларускай літаратурнай мовы ў неспрыяльных гістарычных умовах; спыненне яе далейшага развіцця.

## Новая беларуская літаратурная мова

1. Далучэнне Беларусі да Расіі ў канцы XVIII ст. у выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай. Працяглае і своеасаблівае развіццё беларускай культуры, літаратуры і мовы ва ўмовах адсутнасці беларускай дзяржаўнасці.

2. Адсутнасць друкаванай літаратуры на беларускай мове ў першыя гады пасля далучэння Беларусі да Расіі. Ужыванне на Беларусі рускай мовы як мовы дзяржаўнай у справаводстве, ва ўстановах, у школах.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

Імкненне беларускага народа стварыць літаратуру на роднай мове. Першыя публікацыі па-беларуску. Адносіны грамадскасці да новай беларускай літаратуры.

Рэпрэсіі царскага ўрада супраць беларускага нацыянальна-вызваленчага руху і іх адмоўны ўплыў на развіццё беларускай літаратуры і літаратурнай мовы ў дакастрычніцкі час.

3. Мастацкая літаратура як галоўная сфера фарміравання і развіцця новай (сучаснай) беларускай літаратурнай мовы.

Арганічная сувязь ананімных твораў беларускай літаратуры першай палавіны XIX ст. (вершаваных апавяданняў, так званых “гутарак”, паэм “Энеіда навыварат”, “Тарас на Парнасе”) з жывым маўленнем і вусна-паэтычнай творчасцю народа. Графіка-арфаграфічныя асаблівасці, фанетычныя і граматычныя з’явы, лексічны склад гэтых твораў.

Моўныя асаблівасці беларускіх твораў пісьменнікаў першай палавіны XIX ст. (Я.Баршчэўскага, А.Рыпінскага, Я.Чачота і інш.).

Ступень літаратурнай апрацоўкі мовы твораў беларускай мастацкай літаратуры першай палавіны XIX ст., адсутнасць у іх непасрэдных сувязей з моўна-стылістычнымі традыцыямі старажытнай літаратуры, дыялектная аснова моватворчасці тагачасных беларускіх пісьменнікаў, жарганізмы і іншамоўныя запазычанні ў іх мове. Граматычны і арфаграфічны разнабой у бела-рускіх выданнях першай палавіны XIX ст., тэматычная абмежаванасць лексікі.

Значэнне твораў беларускай мастацкай літаратуры першай палавіны XIX ст. у станаўленні новай беларускай літаратурнай мовы.

4. Беларуская мастацкая літаратура другой палавіны XIX ст. і далейшае складванне новай беларускай літаратурнай мовы. Роля тагачасных пісьменнікаў (В.Дуніна-Марцінкевіча, Ф.Багушэвіча і іншых) у яе фарміраванні. Развіццё літаратурнай мовы гэтымі пісьменнікамі на аснове жывога беларускага маўлення; прынцыпы выкарыстання імі моўных скарбаў вуснай народнай творчасці, розных іншамоўных сродкаў (запазычаных галоўным чынам з рускай і польскай літаратурных моў). Дыялектныя рысы ў мове твораў беларускай мастацкай літаратуры другой палавіны XIX ст. Своеасаблівасць літаратурнай апрацоўкі нацыянальнай мовы пісьменнікамі розных ідэалагічных напрамкаў.

Публіцыстыка на беларускай мове ў другой палавіне XIX ст. (так званыя “гутаркі”, нелегальная друкаваная газета К.Каліноўскага “Мужыцкая праўда” і іншыя творы); яе моўна-стылістычныя асаблівасці; значэнне ў развіцці літаратурнай мовы.

Папаўненне лексікі і фразеалогіі ў другой палавіне XIX ст. новымі словамі і зваротамі з розных сфер вытворчасці і побыту, узбагачэнне сродкаў і прыёмаў літаратурнага выказвання ў сувязі з далейшым развіццём беларускай літаратуры. Моўна-стылістычная аднастайнасць твораў

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

беларускай літаратуры другой палавіны XIX ст., абмежаванасць іх слоўніка, асабліва ў галіне кніжнай абстрактнай і навуковай лексікі. Граматычна-правапісныя асаблівасці беларускіх выданняў другой палавіны XIX ст., адсутнасць сталых агульнапрынятых граматычных і арфаграфічных нормаў у тагачасным беларускім кнігадрукаванні; выкарыстанне пры публікацыі твораў на беларускай мове дзвюх графік: польскай і рускай.

5. Ажыўленне беларускай літаратуры ў пачатку XX ст., абумоўленае ўзмацненнем рэвалюцыйнага руху ў Расіі, уздымам нацыянальна-вызваленчай барацьбы беларускага народа і вымушаным дазволам царскіх улад друкаваць арыгінальныя творы на беларускай мове. Прыход у беларускую літаратуру Я.Купалы, Я.Коласа, Цёткі, М.Багдановіча і іншых пісьменнікаў. Пашырэнне кнігадрукавання на беларускай мове, паяўленне першых беларускіх выдавецкіх арганізацый і беларускай легальнай прэсы. Далейшае развіццё мастацкай літаратуры і публіцыстыкі, зараджэнне новых жанраў у беларускай літаратуры і значэнне гэтых фактараў для ўдасканалення літаратурнай мовы.

Узбагачэнне слоўніка і фразеалогіі беларускай літаратурнай мовы ў пачатку XX ст., выкліканае развіццём грамадска-палітычных адносін, тэхнікі і мастацтва, пашырэнне друкаванага беларускага слова. Крыніцы папаўнення літаратурнай лексікі і фразеалогіі: тэрытарыяльныя дыялекты і прафесійныя гаворкі, іншамоўныя запазычанні, індывідуальная словатворчасць пісьменнікаў. Удаска-наленне прыёмаў выкарыстання лексіка-фразеалагічных багаццяў народнай мовы і іншамоўных запазычанняў у мастацкай, публіцыстычнай і часткова навукова-папулярнай літаратуры. Графічныя і граматычна-правапісныя асаблівасці беларускіх выданняў пачатку XX ст. Асноўныя тэндэнцыі развіцця і ўдасканалення марфалагічнай і сінтаксічнай сістэм беларускай нацыянальнай літаратурнай мовы ў розных жанрах мастацкай літаратуры і публіцыстыкі. Паступовая выпрацоўка граматычных і арфаграфічных нормаў.

Выкарыстанне дыялектных і прастамоўных слоў і выразаў у творах беларускай літаратуры пачатку XX ст. у выніку адсутнасці сталых нормаў словаўжывання. Няўстойлівасць граматычных нормаў беларускай літаратурнай мовы, адсутнасць адзінай агульнапрынятай і абавязковай арфаграфіі, ужыванне дзвюх графік (заснаваных на рускай і польскай графічных сістэмах, але некалькі змененых) у тагачасным беларускім кнігадрукаванні. Стылістычная абмежаванасць беларускай літаратурнай мовы ў пачатку XX ст.

6. Навуковая распрацоўка беларускай мовы ў дакастрычніцкі час; яе значэнне для ўзбагачэння выяўленчых сродкаў і нармалізацыі беларускай літаратурнай мовы.

7. Узнікненне новых сацыяльна-палітычных умоў для развіцця беларускай літаратурнай мовы пасля рэвалюцыйных падзей 1917 г.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

Пашырэнне яе грамадскіх функцый у выніку абвяшчэння савецкімі ўладамі раўнапраўя існуючых у Савецкім Саюзе моў і фармальнага надання ім статуса дзяржаўных. Узрастанне ролі беларускай літаратурнай мовы як найважнейшага сродку будаўніцтва нацыянальнай культуры беларускага народа, асабліва ў сувязі з працэсамі беларусізацыі грамадскага жыцця ў БССР у 20-я гады. Пашырэнне сфер выкарыстання беларускай літаратурнай мовы ў яе пісьмовай і вуснай формах; распаўсюджанне літаратурных нормаў у народных масах у выніку ліквідацыі непісьменнасці. Змены ва ўзаемаадносінах паміж літаратурнай мовай і рознымі адгалінаваннямі агульнанароднай мовы (тэрытарыяльнымі дыялектамі, прафесійнымі гаворкамі і жаргонамі). Пашырэнне дыялектнай базы беларускай літаратурнай мовы пасля ўз’яднання беларускага народа ў 1939 г.

8. Змены ў структуры беларускай літаратурнай мовы ў паслякастрычніцкі час.

Далейшае развіццё і ўдасканаленне стыляў мастацкай літаратуры і публіцыстыкі беларускай літаратурнай мовы. Складванне новых стыляў: навуковага, прафесійна-тэхнічнага, афіцыйна-справаводнага і інш. Выпрацоўка ўнармаванага вуснага маўлення.

Рост слоўніка і фразеалогіі беларускай літаратурнай мовы ў сувязі з выкарыстаннем яе ў розных сферах грамадскай дзейнасці і карэннымі пераўтварэннямі ў жыцці беларускага народа. Узнікненне неалагізмаў і развіццё новых значэнняў у асобных словах, змены ў эмацыянальнай і стылістычнай афарбоўцы шэрагу слоў і выразаў. Павелічэнне пласта інтэрнацыянальнай лексікі, шырокае пранікненне ў беларускую літаратурную мову лексічных запазычанняў з іншых моў, галоўным чынам з рускай літаратурнай мовы. Дадатныя і адмоўныя бакі гэтага працэсу. Стварэнне беларускай нацыянальнай тэрміналогіі і шляхі далейшага папаўнення тэрміналагічных сродкаў. Роля словаўтварэння ва ўзбагачэнні слоўніка і найбольш актыўныя словаўтваральныя працэсы ў сучаснай беларускай мове. Выцясненне некаторых тэматычных груп слоў і выразаў з актыўнага ўжытку. Замацаванне нормаў словаўжывання ў беларускай літаратурнай мове. Адлюстраванне працэсаў развіцця і ўзбагачэння лексікі і фразеалогіі беларускай літаратурнай мовы ў лексікаграфічных працах паслякастрычніцкага часу.

Кадыфікацыя граматычных нормаў і стварэнне адзінага дзяржаўнага правапісу. Замацаванне адзінай графічнай сістэмы і арфаэпічных нормаў.

Першыя нарматыўныя граматыкі беларускай мовы. Роля лексікаграфічных і граматычных распрацовак у стандартызацыі і далейшым удасканаленні беларускай літаратурнай мовы.

9. Роля мастацкай літаратуры ў развіцці сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

Погляды Я. Купалы і Я. Коласа на мастацкае слова, на ролю беларускай літаратурнай мовы ў нацыянальна-культурным развіцці. Народныя і кніжныя вытокі мовы Я. Купалы і Я. Коласа. Словатворчасць Я. Купалы і Я. Коласа. Узбагачэнне імі слоўніка, фразеалогіі і стылістычных сродкаў беларускай літаратурнай мовы. Барацьба Я. Купалы і Я. Коласа за адзіныя нормы беларускай літаратурнай мовы, за яе чысціню і выразнасць. Народнасць мовы Я. Купалы і Я. Коласа, моўны рэалізм і багацце моўнавыяўленчых сродкаў іх твораў. Роля Я. Коласа ў развіцці стылю мастацкай прозы беларускай літаратурнай мовы.

Развіццё літаратурнай мовы новым пакаленнем беларускіх пісьменнікаў на аснове, закладзенай Я. Купалам і Я. Коласам. Значэнне мастацкай літаратуры для замацавання і пашырэння новых моўных з'яў, што ўзнікаюць у публіцыстыцы, навуцы, жывой гаворцы.

10. Роля публіцыстычных і іншых стыляў у стабілізацыі агульналітаратурных моўных нормаў, ва ўзбагачэнні і ўдасканаленні сродкаў і прыёмаў літаратурнага выказвання.

11. Фактычнае замацаванне за рускай мовай функцый дзяржаўнай мовы ў былым Савецкім Саюзе. Паступовае ўзмацненне курса на "зліццё" моў народаў Савецкага Саюза і асімілятарская роля рускай мовы ў ажыццяўленні гэтага курса. Няўхільнае звужэнне сфер выкарыстання беларускай літаратурнай мовы, асабліва ў апошнія гады існавання Савецкага Саюза. Дэфармацыя яе нацыянальнай самабытнасці ва ўмовах усё нарастаючай русіфікацыі. Пастанова ўрада БССР "Аб зменах і спрашчэнні беларускага правапісу" (1933) як сведчанне павароту ў дзяржаўнай палітыцы на "зліццё" моў. Адлюстраванне гэтай тэндэнцыі ў наступных распрацоўках правапісу і граматыкі беларускай мовы, яе лексіка-фразеалагічных сродкаў і стылістыкі, у моўнай практыцы беларускага друку.

12. Перспектывы развіцця беларускай літаратурнай мовы ва ўмовах дзяржаўнага суверэнітэту Беларусі і прызнання за ёй функцый дзяржаўнай мовы ("Закон аб мовах у БССР" і прынятая на яго аснове ў верасні 1990 г. "Дзяржаўная праграма развіцця беларускай мовы і іншых нацыянальных моў у Беларускай ССР"). Дзве канцэпцыі абнаўлення літаратурных нормаў.

13. Новыя сацыяльна-палітычныя ўмовы для развіцця беларускай літаратурнай мовы, што ўзніклі ў выніку надання рускай мове на Беларусі статуса дзяржаўнай пасля рэферэндуму 1995 г. Зніжэнне сацыяльнай ролі беларускай мовы ва ўмовах двухмоўя, звужэнне сфер яе выкарыстання. Новая рэдакцыя "Закона аб мовах у Рэспубліцы Беларусь".

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

## Літаратура

*Жураўскі, А. І.* Гісторыя беларускай літаратурнай мовы / А. І. Жураўскі. – Мінск, 1967. – Т. 1. – 371 с.

*Карский, Е. Ф.* Белорусы / Е. Ф. Карский. – Пг., 1921. – Т. 3. – Кн. 2. – 250 с.

*Крамко, І. І.* Гісторыя беларускай літаратурнай мовы / І. І. Крамко, А. К. Юрэвіч, А. І. Яновіч. – Мінск, 1968. – Т. 2. – 342 с.

*Шакун, Л. М.* Гісторыя беларускай літаратурнай мовы / Л. М. Шакун. – 2-е выд. – Мінск, 1984. – 319 с.

*Шакун, Л. М.* Карані роднай мовы / Л. М. Шакун. – Мінск, 2001. – 205 с.

Беларуская мова / А. А. Лукашанец, М. Р. Прыгодзіч, Л. І. Сямешка. – Opole, 1998. – 294 с.

Беларуская мова: энцыкл. / пад рэд. А. Я. Міхневіча. – Мінск, 1994. – 655 с.

*Булыка, А. М.* Мова выданняў Францыска Скарыны / А. М. Булыка, А. І. Жураўскі, У. М. Свяжынскі. – Мінск, 1990. – 253 с.

*Падлужны, А. І.* Мова і грамадства / А. І. Падлужны. – Мінск, 1997. – 84 с.

*Плотнікаў, Б. А.* Кароткая гісторыя беларускай мовы і мовазнаўства / Б. А. Плотнікаў. – Мінск, 2002. – 103 с.

*Плотнікаў, Б. А.* Беларуская мова: лінгвістычны кампендыум / Б. А. Плотнікаў, Л. А. Антанюк. – Мінск, 2003. – 671 с.

*Яскевіч, А. А.* Старабеларускія граматыкі / А. А. Яскевіч. – Мінск, 1996. – 352 с.

*Красней, В. П.* Практыкум па гісторыі беларускай мовы / В. П. Красней, Л. М. Шакун. – Мінск, 1986. – 208 с.

Хрэстаматыя па гісторыі беларускай мовы / пад рэд. А. І. Жураўскага. – Мінск, 1961. – Ч. 1. – 539 с.; 1962. – Ч. 2. – 327 с.

Хрэстаматыя па старажытнай беларускай літаратуры / склад. А. Ф. Коршунаў. – Мінск, 1959. – 473 с.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

# Змест

**Частка I. Гістарычная граматыка беларускай мовы.**
Тлумачальная запіска …………………………..……………….. 3
Уводзіны ………………………………………………..……… 4
Фанетыка ……………………………………………………… 5
Марфалогія …………………………………………………….. 10
Сінтаксіс ……………………………………………………...... 15
Лексікалогія ……………………………………………………. 17
Літаратура ……………………………………………………… 19
**Частка II. Гісторыя беларускай літаратурнай мовы**
Тлумачальная запіска …………………………………………. 20
Уводзіны ……………………………………………………….. 21
Літаратурная мова ўсходніх славян XI – пачатку XIV стст. .. 22
Старабеларуская літаратурная мова …………………………. 23
Новая беларуская літаратурная мова ………………………… 25
Літаратура ……………………………………………………… 30

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

Вучэбнае выданне

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

Вучэбная праграма
для вышэйшых навучальных устаноў
па спецыяльнасці 1-21 05 01 Беларуская філалогія

Складальнікі: **Шакун** Леў Міхайлавіч, **Красней** Віктар Пятровіч,
**Кулеш** Ганна Іванаўна і інш.

Адказны за выпуск *М. І. Свістунова*
Камп'ютэрная вёрстка *Н. У. Раготнер*
Карэктар *В. С. Ярмак*

Падпісана да друку 15.06.2006. Фармат 60x84/16. Папера афсетная. Гарнітура "Times".
Рызаграфія. Ум. друк. арк. 1,86. Ул.-выд. арк. 2,49. Тыраж 100 экз. Зак. № 56.

Выдавец і паліграфічнае выкананне
Дзяржаўная ўстанова адукацыі
"Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы".
ЛВ №02330/0133359 ад 29.06.2004.
220001, Мінск, вул. Маскоўская, 15.